БЫЦЬ РАЗАМ З ІНШЫМІ, БЫЦЬ У ЦЭНТРЫ ПАДЗЕЙ

Што яшчэ падарыў «Марафон адзінства» сталіцы

Ад сустрэч з размовамі пра асабістае і агульначалавечае да маштабных і значных выставак, ад спеваў на прадпрыемствах і проста на вуліцы да вялікіх канцэртаў — рэспубліканская грамадска-культурная акцыя робіць свае яркія прыпынкі ў розных раёнах сталіцы нашай краіны, ладзячы імпрэзы для людзей розных узростаў і прафесій, такім чынам, праз незабыўныя падзеі і святочную атмасферу, яднаючы грамадзян Беларусі.

НОВЫЯ АДКРЫЦЦІ

Яркае незабыўнае мерапрыемства прайшло позна ўвечары чацвярга ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, якая гасцінна расчыніла свае дзверы і запрасіла ўсіх ахвотных акунуцца ў калейдаскоп «Ночы адкрыццяў».

— Мы не маглі застацца ўбаку, калі «Марафон адзінства» прыйшоў у Мінск. Мы ўжо даўно думалі аб тым, як злучыць разам музыку, тэатр, вершы, кнігу, лекцыі. І вось з'явілася цудоўная магчымасць. Чаму б ёю не скарыстаць? У працэсе падрыхтоўкі падключыліся ўсе: Вялікі тэатр Беларусі, блогеры, Саюз журналістаў, нашы тэлеканалы, — адзначыў **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім ГІГІН.**

Па словах кіраўніка бібліятэкі, «Марафон адзінства» сапраўды паказвае, як можна працаваць сучасна, творча падыходзіць да любой справы. Асабліва да такіх важных, як інфармаванне людзей і асвета.

— Адукацыя, выхаванне — важна, але асвета — гэта місія бібліятэк. А вось як мы гэту асвету рэалізуем, ужо залежыць ад нашага творчага падыходу, — заключыў Вадзім Гігін.

У вечар чацвярга падыход быў вельмі творчым. Бібліятэка прапанавала мноства тэматычных пляцовак, дзе кожны мог знайсці занятак па душы. Майстар-класы па народнай творчасці, інтэрактыўная праграма БРСМ, міні-канцэрт артыстаў Вялікага тэатра Беларусі, серыя майстар-класаў ад Саюза журналістаў Беларусі, шматлікія выстаўкі і шмат усяго іншага цікавага, захапляльнага і карыснага...

Таксама падчас мерапрыемства госці бібліятэкі маглі далучыцца да актыўнай экскурсіі-квэсту «Шлях Вялікай Перамогі». Паводле слоў **загадчыка сектара аддзела экскурсійна-метадычнай работы Іны КАРАНІНАЙ**, гэты квэст прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі. Удзельнічаць у ім маглі як дзеці сярэдняга школьнага ўзросту, так і дарослыя.

— У рамках гэтай падзеі ў нас па бібліятэцы размешчаны пазнакі з QR-кодамі, іх трэба знайсці па карце і выканаць заданне, тым самым паглыбіўшы свае веды аб подзвігах нашых герояў і падзеях часоў Вялікай Айчыннай вайны, — растлумачыла яна.

Галоўная мэта — у выніку выканання заданняў адкрыць важнае слова. Пасля гэтага квэст лічыцца завершаным і яго ўдзельніку належыць падарунак — уздым на аглядную пляцоўку. Цікава і тое, што гэты квэст адрозніваецца ад тых, якія раней праводзіліся ў бібліятэцы.

— Перш за ўсё ён арыентаваны на самастойнае праходжанне. Гэта аптымальны варыянт для фармату мерапрыемства, таму што нашым гасцям не трэба быць прывязаным да групы, а можна ўсё выконваць самому, — заключыла Іна Караніна.

Нікога з наведвальнікаў «Ноч адкрыццяў» не пакінула абыякавымі. Кожны знайшоў для сябе нешта новае, добра правёў час і паглядзеў на Нацыянальную бібліятэку Беларусі з іншага боку.

«НЕАБХОДНА МЕЦЬ УНУТРАНУЮ СІЛУ»

Навучэнцы Мінскага дзяржаўнага каледжа гандлю і камерцыі ў пятніцу мелі магчымасць задумацца пра тое, што значыць быць асобай. Для іх «НЯсумная НЯлекцыя» пачалася з экзістэнцыяльных пытанняў: пра выбар, жыццёвыя перспектывы і планы на будучыню. Вядома, ёсць пытанні, на якія кожны шукае адказ сам. Але калі жывеш у грамадстве, то яно так ці інакш уплывае на тваё светаадчуванне і разуменне таго, як дзейнічаць у той ці іншай сітуацыі. Нездарма такія сур'ёзныя тэмы ўздымаліся падчас размовы з маладымі людзьмі **дырэктарам Навукова-даследчага інстытута тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Марыянай ШЧОТКІНАЙ.** Моладзь, якая неўзабаве будзе працаваць на эканоміку краіны, пакуль набывае веды па прафесіі, але адначасова аналізуе і робіць высновы з таго, што бачыць і чуе, тому кожная сустрэча, кожнае слова паважанага госця ці чалавека, які дасягнуў вышыню у прафесіі і кар'еры, мае вагу.

Марыяна Шчоткіна распавяла пра свой прафесійны і жыццёвы шлях, які, дарэчы, прывёў яе на работу ў органы кіравання беларускай дзяржавы. Але кожны чалавек у жыцці робіць выбар незалежна ад таго, на якой пасадзе працуе і чым займаецца. «Вы заўсёды павінны ўмець пастаяць за сябе. Вы адказваеце за сябе, вас будуць паважаць, калі будзеце моцнай асобай. Гэта значыць, што неабходна мець унутраную сілу. Мы гаворым аб асобасным патэнцыяле, а гэта магчымасць развівацца. Такая магчымасць ёсць абсалютна ў кожнага», — адзначыла дырэктар Навукова-даследчага інстытута тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце.

Жыць у Беларусі — гэта таксама выбар. Марыяна Шчоткіна звярнулася да прысутных: «Што такое краіна магчымасцяў? Гэта калі ўсё залежыць ад цябе. Не думайце, што нехта будзе весці вас па жыцці — толькі вы самі. Калі вы цікавыя, пастаянна развіваецеся, то магчымасці будуць заўсёды. Мы павінны сябе шанаваць. Трэба памятаць, што ты асоба, але і побач з табой таксама асобы». Размова з маладымі пра іх магчымасці зразумелая: яны плануюць сваю будучыню, шукаюць шляхі развіцця і ставяць амбіцыйныя мэты, але ад іх залежыць наша агульнае заўтра.

МУЗЫЧНЫ ПАДАРУНАК ДЛЯ «КАМАРОЎКІ»

Апошні канцэрт «Разам працуем, разам спяваем» у рамках марафону прайшоў у незвычайнай лакацыі. Сцэна размясцілася паміж прылаўкамі з агародніной і прысмакамі на любімым у мінчан і гасцей сталіцы Камароўскім рынку. Такі творчы падарунак ацанілі не толькі работнікі рынку, але і пакупнікі. Адна з бабуль, якой удалося не толькі праспяваць «Чужую мілую» разам з Аляксандрам Саладухам, але і падняцца на сцэну да любімага артыста, прызналася, што эмоцыі яе перапаўняюць.

Гледачамі канцэрта сталі не толькі выпадковыя наведвальнікі рынку. Шмат хто ехаў на «Камароўку» спецыяльна, каб сустрэцца з любімымі артыстамі. Яны пачалі збірацца вакол сцэны загадзя. Адным з першых зручнае месца пастараўся заняць **Яўген БАЕШКА** — хлопец прыехаў на інваліднай калясцы. Ён прызнаўся, што жыве ў іншым раёне, і на «Камароўку» прыехаў менавіта па ўражанні. Яму падабаюцца падобныя яскравыя мерапрыемствы, і па магчымасці ён стараецца іх не прапускаць. Важна толькі, каб на такіх канцэртах стваралася безбар'ернае асяроддзе. Марафон для яго — гэта найперш свята, а яшчэ выдатная магчымасць адчуць, як дружна жывуць людзі, што ёсць падтрымка ў грамадстве. «Дзякуючы нашаму Прэзідэнту мы жывём у мірнай краіне, адчуваем, што мы адзіныя, і гэта якраз выдатна паказвае марафон», — падзяліўся хлопец.

Незвычайная, здавалася б, не прызначаная для канцэртаў, пляцоўка нічым не засмуціла артыстаў ансамбля народнай музыкі «Бяседа». «Нам вельмі радасна выступаць для народа, нашай сталіцы, любімай краіны. Для нас усе пляцоўкі і ўсе гледачы роўныя. Мы не глядзім: гэта Палац Рэспублікі ці звычайны сельскі клуб. Заўсёды гэта вельмі душэўныя сустрэчы, куды мы прыходзім з адкрытымі сэрцамі і любімымі песнямі, якія гледачы спяваюць разам з намі», — падзяліўся **саліст ансамбля «Бяседа», уладальнік медаля Францыска Скарыны, нагруднага знака за ўклад у развіццё культуры Беларусі Валянцін КІРЫЛЕНКА.** Галоўнае, любая сустрэча — магчымасць далучыць людзей да сапраўднага мастацтва, спадчыны, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне. «Марафон адзінства», па словах суразмоўцы, — гэта прыступка, на якую ўсім трэба ўзняцца, каб крочыць у будучыню: «Мы павінны імкнуцца да вяршынь, але важна, каб захоўвалася і прымнажалася тое, што маем».

Старшыня Мінскага гарадскога савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН перад пачаткам канцэрта на «Камароўцы» заўважыў, што, па сутнасці, гэта адно з фінішных мерапрыемстваў «Марафону адзінства» і ўжо можна падводзіць пэўныя вынікі: «Мы былі на многіх прадпрыемствах — нашых флагманах, тых, што сталі ўжо брэндавымі ў горадзе і нашай краіне. Практычна ўсюды бачылі ўпэўненасць работнікаў прадпрыемстваў, жыхароў у заўтрашнім дні». Вядома ж, такое адчуванне нарадзілася не сёння, на гэта краіна працавала 30 гадоў, яшчэ з часоў развалу Савецкага Саюза, калі прымаліся сур'ёзныя рашэнні, накіраваныя на тое, каб захаваць нашу прамысловасць.

«Сёння ў цэнтры палітыкі нашай дзяржавы стаіць чалавек — працоўны, творца, навучэнец, пенсіянер. Кожны ведае, што ён жыве ў ціхай, мірнай краіне і заўтра будзе такі ж добры дзень, — звярнуўся Арцём Цуран да гледачоў і заклікаў прыходзіць на выбарчыя ўчасткі. — Мы разам, мы адзіныя. Давайце зробім выбар на карысць нашых маладых людзей, каб і далей у нашай краіне быў мір, спакой і дабрабыт».

«Марафон адзінства» не спыняецца. Сёння, 25 студзеня, ён робіць яшчэ адзін «народны» прыпынак каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дзе з раніцы ўсіх ахвотных запрашае на квэст «Гэта ўсё маё роднае», апоўдні — на акцыю «Гэта мая краіна», а 15-й гадзіне — на канцэрт «Мы разам!»... Выхадны дзень, зручны час. Імпрэза адбудзецца пры любым надвор'і, бо цёпла там, дзе ёсць добрыя людзі.

Лізавета ГОЛАД,
Ларыса ЦІМОШЫК,
Ганна ПЯТРОВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД,
Віктара ДРАЧОВА, БелТА.



Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона / Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by
Продавец	ИП Свирский Олег Валерьевич, УНП 692091882
Предмет электронного аукциона: Здание котельной (Здание специализированное коммунального хозяйства), инв. номер 610/С-43377, общей площадью 1362 кв. м, расположенное по адресу Минская обл., Борисовский р-н, Пригородный с/с, аг. Старо-Борисов, ул. Дорожная, д. 1.	**Начальная цена (без НДС), бел.руб.: 1 200 000,00**

Сведения о земельном участке с кадастровым номером 620887408101000250: предоставлен на праве аренды по 04.05.2122 г. для обслуживания котельной общей площадью 0,8859 га.

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на расчетный счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО "Банк БелВЭБ", БИК BELBBY2X. Получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638.

Срок подписания договора купли-продажи и оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней после проведения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона.

Условия оплаты предмета электронных торгов:

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом торговой площадки «ИПМ-Торги»: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 2 % от цены продажи лота в течение 3 дней после проведения электронных торгов.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя торгов, без объяснения причин снятия.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 26.02.2025 с 11.00 до 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

Заявки на участие в электронных торгах **принимаются по 25.02.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

Контактные данные:	Тел.: +375 29-317-95-42; +375 44 704-92-06. Email: info@ipmtorgi.by

---

Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки" извещает о проведении открытого аукциона

Предметы аукциона	Начальная цена, руб.:	Размер задатка, руб.:
Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 141/С-15215 (наименование: жилой дом; назначение: здание блокированного жилого дома), площадью 73,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Кривлянский с/с, д. Большие Сеховичи, ул. Центральная, 22, на земельном участке с кадастровым номером 122581001601000106, площадью 0,2500 га, составные части и принадлежности: пристройка, сарай, сарай, сарай, уборная	32 184,96	3 218,50
Лот № 2: капитальное строение с инвентарным номером 141/С-15214 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома), площадью 51,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Кривлянский с/с, аг. Матеевичи, ул. Новая, 27, на земельном участке с кадастровым номером 122581005601000177, площадью 0,2500 га, составные части и принадлежности: пристройка, погреб, сарай, сарай, колодец	15 445,73	1 544,57
Лот № 3: капитальное строение с инвентарным номером 101/С-3312 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома), площадью 36,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Кривлянский с/с, д. Большие Сеховичи, ул. Центральная, 33, на земельном участке с кадастровым номером 122581001601000054, площадью 0,2010 га, составные части и принадлежности: холодная пристройка, четыре сарая, уборная, колодец	16 135,66	1 613,57

Продавец: ОАО «Матеевичи», 225101 Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Кривляны, ул. Ленина, 5-1, тел. 80164131445. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, т/ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/сч для перечисления **задатка:** р/с BY32BAPB30122786600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона.

Аукцион состоится 25 февраля 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также их можно узнать по телефонам 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений — 24 февраля 2025 г. до 17.00

Информация о проведение аукциона

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность **земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

в дер. Заречье, дер. Кулешовка, Драчковского сельсовета, Смолевичского района, Минской области

1	Форма проведения аукциона	открытый
2	Место, дата и время проведения аукциона и подведения итогов	аг. Драчково, ул. Центральная, д. 19В. Помещение Драчковского сельисполкома, 27.02.2025 г. в 11-00.
3	Продавец и его адрес	аг. Драчково, ул. Центральная, д .19В, Драчковский сельский исполнительный комитет
4	Организатор аукциона	Драчковский сельский исполнительный комитет
5	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	**Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1442 га, кадастровый номер 624880802901000226, дер. Заречье, ул. Зареченская,8Б **Лот № 2** – земельный участок площадь 0,1525 га, кадастровый номер 624880803401000114, дер. Кулешовка, ул. Загорская, 2А
6	Вид права, целевое назначение земельного участка	Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земель для размещения объектов усадебной застройки)
7	Начальная (стартовая) цена продажи	Лот №1 – 20000 рублей; Лот № 2 – 17000 рублей;

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета www.minsk-region.gov.by, Смолевичского районного исполнительного комитета https://isp@smolevichi.gov.by/

УНП 600046589

ЗАО «Центр промышленной оценки» (УНП 191021390) – проводит третьи повторные торги в форме открытого аукциона по продаже:

ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ, ОБОРУДОВАНИЯ

(бывшее в употреблении), принадлежащих **ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод»** (Антикризисный управляющий — ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) — производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 111-2/Б/2017).

С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на www.bankrot.gov.by либо на сайте организатора аукциона www.cpo.by и по тел. +375 29 821-47-15.

Аукцион состоится 11.02.2025 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512. Заявки принимаются с 9.00 27.01.2025 по 10.02.2025 до 17.00 по указанному адресу.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу (Гродненский филиал).

Аукцион состоится **06.02.2025 г. в 11.00** по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок: 55-87-71

Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-159346 (назначение – здание многофункциональное, наименование – здание административно-торгового и общественного питания), площадью 1 564,50 кв. м, г. Гродно, ш. Озерское, 43 и пожарная сигнализация ГР0000253. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001008366, площадью 0,1170 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания многофункционального), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 43. Условия проведения аукциона: - оплату за приобретаемый объект производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь; - расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя; - право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; - документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.
Начальная цена продажи	684 846,33 р. (шестьсот восемьдесят четыре тысячи восемьсот сорок шесть рублей тридцать три копейки) с учетом НДС
Сумма задатка	68 484 р. (шестьдесят восемь тысяч четыреста восемьдесят четыре рубля)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник—четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений — 04.02.2025 г. до 15.00

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/

Управляющий в деле о банкротстве ООО «МодиФормТорг» просит считать печати и штампы, свидетельство о государственной регистрации ООО «МодиФормТорг» (УНП 693153296) НЕДЕЙСТВИТЕЛЬНЫМИ в связи с утерей